**Матырка, В.** Сувязіст / В. Матырка // Лепельскі край. — 2008. — 22 лют. — С. 2.

# СУВЯЗІСТ

Уладзімір Маляўка – ўраджэнец вёскі Слабодка, Лепельскага сельсавета. Пасля заканчэння Старалядненскай няпоўнай сярэдняй школы крыху папрацаваў, а потым быў прызваны ў армію на тэрміновую вайсковую службу. У арміі трапіў у вучэбную часць войск сувязі, там і атрымаў спецыяльнасць сувязіста. Пасля звальнення ў запас пяць гадоў адпрацаваў у вузле сувязі. Сувязістам на той час плацілі мала, таму ў 1975 годзе Уладзімір вырашыў пайсці ў армію на звыштэрміновую службу. Спачатку яго накіравалі ў школу прапаршчыкаў, а далейшую службу праходзіў у Бароўцы. Пачалася вайна ў Афганістане. У 1982 годзе ў Афган накіравалі і начальніка радыёстанцыі прапаршчыка Маляўку. У правінцыі Кундуз, дзе стаяла часць Віктара, летам спёка даходзіла да +60. У той час, як у гарах ляжаў снег. У зімовыя месяцы паветра напаўнялася сырасцю.

Асноўным службовым абавязкам Уладзіміра стала наладжванне трывалай сувязі паміж часцямі і падраздзяленнямі. На просьбу параўнаць радыётэхніку савецкіх войск і душманаў Уладзімір сказаў наступнае:

– Наша апаратура на аўтамабілях была выдатная: простая ў карыстанні, надзейная, пакрывала вялікую прастору. Варыянт заплечны меў тыя ж плюсы пры адным, але істотным, мінусе – вялікай вазе. Сама рацыя важыла 15 кг, а камплект акумулятараў да яе – яшчэ 12 кг. Такім чынам салдат-радыст на сабе нёс 27 кг. А дадаць яшчэ зброю, боепрыпасы, бронежылет, харчаванне, бушлат... Атрымліваецца, што салдат, ідучы на баявую аперацыю ў горы, нёс па 50–60 кг рознага рыштунку. У душманаў жа на той час на ўзбраенні былі навейшыя імпартныя рацыі па тыпу сучасных мабільнікаў.

Самі па сабе афганцы – працавіты народ. У іх кліматычнай зоне могуць расці і растуць практычна любыя сельгаскультуры. Але якіх тытанічных намаганняў гэта патрабуе! Сяляне капаюць спецыяльныя каналы і з вяршынь гор спускаюць талую ваду на свае палеткі.

*– Ці шмат людзей загінула ў вашым падраздзяленні?*

– Не так і шмат, але, што самае крыўднае, большасць з іх загінула з-за ўласнай неасцярожнасці. Напрыклад, ехалі калонай, спыніліся. Салдат захацеў збегаць у кусты, хаця яму казалі, што не трэба. Зачапіў міну… Такіх і падобных выпадкаў было багата. Шмат людзей загінула ад хвароб.

*– Як вы ацэньваеце значэнне той вайны?*

– Я магу сказаць толькі адно – просты савецкі салдат на зямлі Афганістана праявіў мужнасць, вынослівасць, высакароднасць. Воіны зрабілі ўсё, што маглі. Вайну бясслаўна прайгралі палітыкі.

*– Якія ўзнагароды вы маеце?*

– У баявых аперацыях удзельнічаў два разы. Забяспечваў сувязь. Служыў пераважна ў размяшчэнні часці, таму баявых узнагарод не маю, у асноўным юбілейныя ды за выслугу гадоў.

**В. Матырка**